Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 18(405) | Субота, 16 красавіка 1960 года | Цана 10 кап.

## ЧЫТАЙ СЕННЯ

☆ Прысвечаная Леніну... —1 стар.
☆ Ідзе абарона дыпломных —1 стар.
☆ Адзіны ў Беларусі —1 стар.
☆ Сябры сустракаюцца зноў —1 стар.
★ Гэта магло не здарыцца —2 стар.
☆ Ізноў рэкорды —2 стар.
☆ Звіняць клінкі —2 стар.
☆ Барацьба ў разгары —2 стар.

## ПРЫСВЕЧАНАЯ ЛЕНІНУ

Пачалася навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Адкрыць яе выпаў гонар біёлагам. 14 красавіка на секцыі біялагічных навук студэнт I круса А. Нішко прачытаў даклад «Трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР». Затым выступіла студэнтка 3 курса Артамонава з дакладам «Ленінская тэорыя імперыялізма і сучасны капіталізм».

Асаблівую цікавасць прысутных выклікаў даклад студэнта 4 курса Налівайкі. Гэта і зразумела. Тэма «У. І. Ленін аб значэнні дыялектычнага матэрыялізма для барацьбы супроць ідэалізма ў біялогіі» асабліва блізкая і хвалюючая для кожнага біёлага.

Я. РАДКЕВІЧ.

## ЯНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ У ЖЫЦЦЁ



**Выдатніца вучобы, што вядзе вялікую навуковую работу ў гуртку сістэматыкі раслін, намеснік рэдактара факультэцкай газеты «За мічурынскую біялогію», цудоўны чалавек—усё гэта здзіўляюча поўна сумешчана ў нашай Тамары Міхеевай.**

**Калі да ўсяго гэтага дадаць любоў нашай Томы да кнігі, фатаграфіі, аўтасправы музыкі, дык і тады вы не атрымаеце поўнага ўяўлення аб гэтай сардэчнай дзяўчыне. Яна любіць прыроду, біялогію і ўсё, што звязана з любімай навукай.**

**У цэлым гэта чалавек,—аб якім гавораць: «майстар на ўсе рукі», «добрая душа», «чулы таварыш», «актывіст».**

**Хутка наша Тамара, як і ўсе яе аднакурснікі, атрымае пуцёўку ў жыццё, якое яна так любіць. І ніхто не сумняваецца, што наша Тамара на любым участку будзе ў радах першых.**

**Н. БАТУРЫНА.**

## Ідзе абарона дыпломных

Гэта аўдыторыя ў корпусе гуманітарных навук выглядзела незвычайна—засланыя чырвоным абрусам сталы, кветкі на вокнах надавалі ёй нейкі святочны, урачысты выгляд. Ідзе ж абарона дыпломных...

10 чалавек абараніла ўжо свае дыпломныя работы на кафедры рускай літаратуры. Усе работы ацэнены вышэйшым балам. Асабліва вызначаецца даследаванне Дайнекі «Ленін і Горкі», у якім выпускніца здолела раскрыць моцныя сяброўскія сувязі, што звязвалі вялікага пралетарскага пісьменніка і генія рэвалюцыі. Зусім заслужана яе работа ацэнена выдатнай адзнакай. На выдатна абараніла сваю дыпломную таксама выпускніца Шчорс на тэму—«Публіцыстыка Леаніда Леонава перыяду ваенных год».

Паспяхова абараняюць дыпломныя работы і журналісты. Цікавая тэма у Рудамётава—«Паэтыка кіножурналістыкі (па матэрыялах беларускага дакументальнага кіно 1945—1960. гг.)». Ён, а таксама таварышы па курсу Акулік, Чарненкава і інш. атрымалі выдатныя адзнакі.

С. БЫСТРЫК.

## Брава, гісторыкі

Бадай што даўно не было ва універсітэце такога выдатнага канцэрта, які далі гісторыкі на аглядзе мастацкай самадзейнасці факультэтаў. У праграме канцэрта былі самыя разнастайныя нумары. Цудоўна прагучэлі ў выкананні хора песні савецкіх кампазітараў.

Прыемнай нечаканасцю для многіх з'явілася выступленне мужчынскага вакальнага ансамблю. Асабліва задушэўна ў яго выкананні прагучэла песня «Бярозы», югаслаўская народная песня «Спліт». З аганьком, пад бурныя апладысменты прысутных выступіў танцавальны калектыў факультэта.

Гісторыкі—найбольш верагодныя прэтэндэнты на першае месца ў аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці універсітэта.

А. БАС.

## Навуковая канферэнцыя

Чатыры дні праходзіла ва універсітэце XVII студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная вынікам даследчай работы студэнтаў за бягучы год. У 9 секцыях было прачытана 80 дакладаў. Многія даклады, асабліва прачытаныя на секцыях хімічных, фізічных, біялагічных навук, маюць пэўную практычную і тэарэтычную цікавасць.

Непасрэдна з пытаннямі вытворчасці звязаны даклады студэнтаў А. Якушава (фізфак), Т. Кондылевай, В. Салдаценкі (біяфак) Л. Ціхаміравай (геафак), і іншых.

У рабоце XVII студэнцкай канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі многіх ВНУ краіны.

В. ЖДАНКО.

## ВЕСТКІ З ГЕАФАКА

☆ **Галоўны хірург Міністэрства аховы здароўя БССР т. Кажанкоў выступіў перад студэнтамі факультэта з успамінамі аб асабістых сустрэчах з Леніным. Эмацыянальны, усхваляваны расказ чалавека, якому пашчаслівілася бачыць Ільіча, глыбока крануў сэрцы прысутных.**

☆ **Студэнты 3—4 курсаў рыхтуюцца паехаць на вытворчую практыку. У адрозненне ад мінулых год яна будзе мець практычнае значэнне. Географы правядуць картаграфаванне глебы ў многіх калгасах рэспублікі.**

★ **Па новаму вучэбнаму плану ў сярэдніх школах уводзіцца вучэнне геаграфіі Беларусі, а таксама геграфіі роднай вобласці.**

**Па загаду Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР падручнік па геаграфіі Беларусі рыхтуюць кафедры эканамічнай і фізічнай геаграфіі. Рукапіс павінен быць здадзен ў друк у канцы гэтага года. Да напісання брашур па геаграфіі асобных абласцей прыцягваюцца студэнты.**

★ **Адбылося пасяджэнне вучонага савета факультэта. Вучоны савет разгледзеў пытанне аб выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі. і падрыхтоўцы да летняй. З задавальненнем успрынялі прысутныя вестку аб тым, што на факультэце няма ніводнага студэнта, які меў бы акадэмічную запазычанасць.**

**В. ШЭІН.**

## РЭПАРТАЖ

## *Адзіны у Беларусі*

*У МІНСКУ ёсць некалькі музеяў, якія добра вядомы ўсёй рэспубліцы. Але мала хто з мінчан ведае, што зусім нядаўна ў сталіцы БССР створаны яшчэ адзін музей—гісторыка-археалагічны. Ён размясціўся ў корпусе гуманітарных навук універсітэта.*

*Пазнаёмімся, хаця б бегла, з некаторымі экспанатамі новага музея.*

*Першая зала адлюстроўвае гісторыю развіцця чалавечага грамадства, пачынаючы з першых паселішчаў і канчаючы ранніи сярэднявякоўем. Зала застаўлена вітрынамі, пад шклом якіх выстаўлены сродкі вытворчасці старажытнага каменнага веку: рубілы, рэшткі матыгі з біўня мамантa. Ёсць і розныя часткі шкілета гэтай магутнай жывёлы. Іншыя вітрыны дэманструюць фрагменты гліняных збаноў новага каменнага веку, сродкі працы бронзавай эпохі, ранняга жалезнага веку. Некалькі вітрын расказваюць аб старажытнай Русі, аб старажытных гарадах Мінску і Полацку. Карціны, малюнкі і схемы даюць тлумачэнні аб старажытных стагоддзях. Маецца ў гэтай зале і вітрына «Нумізматыка», дзе сабраны манеты, якія мелі хаджэнне на тэрыторыі Белай Русі.*

*Другая зала музея знаёміць з культурай, мастацтвам, рэлігіяй старажытнага Кітая, Індыі, Егіпта, і многіх іншых краін Азіі і Усходу.*

*Асаблівае месца ў музеі займаюць творы антычных дзеячоў. Выстаўлены скульптуры відных майстроў V—VI стагоддзяў да н. э.: Леахара, Праксітэля, Скопаса Лісіпа і іншых. Ёсць некалькі скульптур невядомых мастакоў гэтай жа пары. Багата прадстаўлена бюставая скульптура. Тут і вялікі сляпы Гамер, і выдатны грэчаскі ўрач Гіпакрат, «выдатны мысліцель старажытнасці» Арыстоцель і многа іншых вядомых дзеячоў антычнага свету...*

*Гэта, зразумела, павярхоўнае знаёмства з музейным багаццем, сярод якога ёсць нямала ўнікальных экспанатаў.*

*— Такі музей збіраліся стварыць яшчэ да вайны,— расказвае Леў Антонавіч Міхайлоўскі, дырэктар музея.—Было сабрана нямала рэчаў. Але тут — вайна. Тое-сёе ўдалося выратаваць, але многае знішчылі фашысты. Самае каштоўнае было вывезена ў Германію. Пасля вайны некаторыя экспанаты ўдалося адшукаць на тэрыторыі Германіі, але вельмі мала.*

*Леў Антонавіч успамінае, з якімі цяжкасцямі збіраліся экспанаты. Многія былі здабыты ў выніку раскопак ў Мінску і ў Полацку. Падзяліліся сваімі каштоўнасцямі Эрмітаж і музеі Масквы. Многім дапамагла Акадэмія навук БССР.*

*— І зараз, як бачыце, ёсць на што паглядзець, — шырока паказвае рукой Леў Антонавіч...*

*Мэта музея — вучэбная, яго пачалі наведваць розныя экскурсіі: цікавасць людзей да далёкага мінулага чалавецтва вялікая.*

*Гісторыка-археалагічны музей БДУ, створаны намаганнямі работнікаў гістфака—дэкана П. З. Савачкіна, дацэнтаў Л. С. Абэцэдарскага, Ф. М. Нечая, Р. А. Нікольскай. Многа і карпатліва папрацавалі над афармленнем музея яго дырэктар Л. А. Міхайлоўскі з лабарантам кафедры гісторыі БССР А. Ігнаценкам. Дапамаглі і студэнты. Добрую справу зрабілі гісторыкі, стварыўшы гэты музей!*

І. ПАТАПАЎ.



Цікава праходзяць практычныя заняткі ў друкарні ў студэнтаў аддзялення журналістыкі. Будучых работнікаў савецкага друку цікавіць усё: і што такое кегль, і што такое літара. А лепш за ўсё даведаешся пра гэта, калі сам станеш за шрыфткасу і возьмеш у рукі верстатку.

Фота М. БАНДАРЭНКІ.

## Сябры сустракаюцца зноў

**Ва ўсіх кутках Беларусі працуюць выхаванцы фізічнага факультэта. Сярод іх можна сустрэць і сціплых настаўнікаў сельскіх школ і вядомых у рэспубліцы вучоных. І вось каля трохсот выпускнікоў з'ехаліся ў Мінск на сваю традыцыйную сустрэчу.**

**Вечар пачаўся дакладам дэкана фізфака т. Халімановіча, у якім ён расказаў аб развіцці факультэта і аб перспектывах яго далейшага росту. Перад сваімі былымі вучнямі выступалі прафесары М. А. Эльяшэвіч, Ф. І. Фёдараў, дацэнт І. Р. Некрашэвіч. Дарагіх гасцей вітала студэнтка І курса Блінова. З вялікай цікавасцю слухала аўдыторыя выступленні людзей, за плячыма якіх ужо немалы практычны вопыт. Настаўніца фізікі І школы г. Мінска Ніна Лукінішна Правільшчыкава закончыла наш універсітэт у 1936 г. Яна расказала, што у час вучобы займалася у кружках Асавіяхіма, была ядрэным стралком і гэта дапамагло ёй вытрымаць нялёгкія выпрабаванні ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі былая студэнтка змагалася ў тылу ворага. Ніна Лукінішна ажыццяўляла многія адказныя заданні партызан. Так, яна ўдзельнічала ў вывадзе навуковых работнікаў з акупіраванага Мінска ў партызанскую зону. Былая партызанка заклікала студэнтаў актыўней удзельнічаць у рабоце абаронных гурткоў ДТСААФ.**

**Супрацоўнік Акадэміі Навук БССР Л. М. Тамільчык заклікаў студэнтаў настойліва авалодваць ведамі. Як кожны салдат, сказаў ён, носіць у сваім ранцы маршальскі жэзл, так кожны студэнт—прафесарскую мантыю.**

**Вечар закончыўся вялікім канцэртам самадзейнасці з удзелам лепшых самадзейных артыстаў універсітэта і падшэфнай воінскай часці.**

**В. КАПЦІЛОВІЧ.**

